Руслан Казлоўскі



# БІБЛІЯТЭКАЗНАВЕЦ, БІБЛІЁГРАФ, КНІГАЗНАВЕЦ, ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ НА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГЛЕБЕ

**Дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

*Рэцэнзія на кнігу М. Пажарыцкага «Навукова-педагагічны дыскурс беларусазнаўчай спадчыны Я.І. Хлябцэвіча (да 140-годдзя з дня нараджэння бібліятэказнаўца)»*




У канцы 2024 г. у выдавецтве Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск) выйшла з друку кніжка выдатнага айчыннага даследчыка-гуманітарыя шырокага профілю, супрацоўніка навуковай бібліятэкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Міхаіла Пажарыцкага «Навукова-педагагічны дыскурс беларусазнаўчай спадчыны Я.І. Хлябцэвіча (да 140-годдзя з дня нараджэння бібліятэказнаўца)» [1]. Трымаючы выданне ў руках, бачыш цэлую эпоху развіцця беларускай літаратуры, бібліятэчнай справы, некаторых аспектаў культуры вачамі вялікага кнігазнаўца першай паловы XX ст. Дадзеная праца ўяўляе сабой бібліяграфічны нарыс, у якім разглядаюцца разнастайныя даследаванні, артыкулы славутага бібліятэчнага дзеяча, асветніка Яўгена Хлябцэвіча (родам з мястэчка Жыровічы Слонімскага павета Гродзенскай губерні) у галіне асэнсавання беларускай мастацкай літаратуры і культуры ў кантэксце грамадска-філасофскай думкі свайго часу, тэндэнцый развіцця айчыннага мастацкага слова і бібліятэказнаўства. Прэзентацыя кніжкі М. Пажарыцкага «Навукова-педагагічны дыскурс беларусазнаўчай спадчыны Я.І. Хлябцэвіча (да 140-годдзя з дня нараджэння бібліятэказнаўца)» адбылася 25 кастрычніка 2024 г. у рамках XI Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры», арганізаванага Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (Мінск) [2, с. 6]. Кнігу заказалі і ўжо атрымалі не толькі шматлікія беларускія бібліятэкі, але і бібліятэкі Расіі, у тым ліку Расійская дзяржаўная бібліятэка (Масква) і Расійская нацыянальная бібліятэка (Санкт-Пецярбург).

Варта адзначыць, што асноўная роля бібліятэкі і бібліятэкара, асабліва ў першай палове XX ст., – транзіт думак і ўяўленняў пісьменніка ад аўтара да чытача. Вынікі паліграфічна-кніжнай матэрыялізацыі каштоўных і дзівосных сюжэтаў былі павінны трапіць у бібліятэку, дзе з'явіцца наведвальнік, каторы зацікавіцца пэўным пісьменнікам ці тэмай. Бібліятэкар быў закліканы




дапамагчы ў вызначэнні і задавальненні адпаведных чытацкіх інтарэсаў і густаў. Шлях грунтоўных бібліятэчных паслуг цярністы, як і рух беларускай культуры і літаратуры таго адрэзка часу. Гаворачы пра Яўгена Хлябцэвіча, Міхаіл Пажарыцкі сцвярджае: «Ён вывучаў не толькі класіку, але і навінкі айчыннай, рускай і замежнай літаратуры як мастацкай, так і іншых відаў, карысныя ў навуковай рабоце і ў справе папаўнення кніжных фондаў публічных бібліятэк. Займаўся рэтраспектыўнай, бягучай і перспектыўнай рэкамендацыйнай бібліяграфіяй па агульнаму сусветнаму, агульнаму рускаму, беларускаму літаратурна-культурнаму працэсу, па персаналіях асобных беларускіх і рускіх аўтараў» [1, с. 5–6]. М. Пажарыцкі разглядае дзейнасць вядомага бібліятэказнаўца як у дакастрычніцкі (да 1917 г.), так і савецкі перыяды. Масавы народны чытач (не элітарны!) становіцца галоўнай мэтай папулярызацыі кніжнай прадукцыі. Я.І. Хлябцэвіч асаблівую ўвагу надаваў беларускай мастацкай літаратуры як выразніцы мар і дум простых людзей, распаўсюджванню якой павінна паспрыяць сетка бібліятэк. Выхаванне чытача ў дэмакратычным кірунку – вядучая задача тагачаснай прагрэсіўнай бібліятэчнай справы, яе выключная місія. Аб'ект уздзеяння – люд звычайны з аднаго боку, з другога – ён жа – носьбіт спрадвечнай народнай мудрасці, шматвекавога практычнага вопыту, геніяльнай традыцыйнай вусна-паэтычнай творчасці.

Публікацыі Я.І. Хлябцэвіча разглядаюцца ў «Навукова-педагагічным дыскурсе...» комплексна і ў храналагічнай паслядоўнасці. Аўтар падкрэслівае, што знакаміты айчынны бібліятэказнавец не абмяжоўваўся аднымі толькі бібліяграфічнымі звесткамі па беларусазнаўчых кірунках, а зарэкамендаваў сябе як навуковец маштабнага агульнабеларускага дыяпазону: бібліёграф, бібліятэказнавец, кнігазнавец, літаратуразнавец, гісторык, мастацтвазнавец.

Аўтар выдання распавядае пра спробы друку Я.І. Хлябцэвіча на бібліятэказнаўчую тэматыку яшчэ ў ранніх беларускамоўных газетах пачатку мінулага стагоддзя «Наша Доля», «Наша Ніва»: «У першых публікацыях Я.І. Хлябцэвіч пісаў аб кансерватыўнасці свядомасці беларускіх сялян, коснасці мыслення, псіхалагічнай непадрыхтаванасці да ўспрымання кнігі, бібліятэкі, чытання, аб праблемах пры адкрыцці бібліятэк, указваў на неабходнасць фарміравання і выхавання ў духу часу масавага народнага чытача» [1, с. 8]. У кнізе разглядаецца даклад на I Усерасійскім з'ездзе па бібліятэчнай справе, у якім аналізавалася праблема распаўсюджвання народных бібліятэк і праз іх кніжнай прадукцыі, дэманстравалася станоўчая дынаміка інтэлектуальнага і грамадзянскага росту вяскоўцаў у бок цывілізаванасці.

Асобна М. Пажарыцкі надае ўвагу дзейнасці Я.І. Хлябцэвіча як актывіста Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, выдаўца справаздачных брашур (матэрыялаў абмеркаванняў і дыскусій з пасяджэнняў гуртка) з уласнымі каментарыямі самога Я.І. Хлябцэвіча. Падкрэсліваецца, што членаў гуртка падтрымлівалі акадэмікі А. Шахматаў, Я. Карскі, пісьменнікі Янка Купала, Якуб



Колас і інш. У кнізе таксама аналізуецца «Нарыс беларускай народнай думкі» Я.І. Хлябцэвіча, дзе бібліятэказнавец разглядае ролю творчасці Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі (А. Пашкевіч), М. Багдановіча і інш. М. Пажарыцкі засяроджваецца і на літаратуразнаўча-бібліяграфічнай працы «Адраджэнне беларускай народніцкай літаратуры», якая ўяўляе сабой фундаментальнае радзімазнаўчае даследаванне: ад вытокаў новай беларускай літаратуры да імён пісьменнікаў-пачаткоўцаў свайго часу.

Пранікнёна даследуецца паслякастрычніцкая беларусазнаўчая дзейнасць Я.І. Хлябцэвіча. М. Пажарыцкі зазначае: «У савецкі перыяд Я.І. Хлябцэвіч займаўся ў асноўным чырвонаармейскімі бібліятэкамі, прычым у агульнасаюзным плане. Ён публікаваў работы па арганізацыі бібліятэчнай сеткі, формах і метадах бібліятэчнай справы ў воінскіх калектывах, па вывучэнню чытацкіх інтарэсаў чырвонаармейцаў, кіраўніцтву іх чытаннем» [1, с. 16]. Упамінаецца артыкул «Нацыянальнае пытанне і праца бібліятэк у Чырвонай Арміі», ключавой думкай якога з'яўляецца ідэя «стварэння ў бібліятэках вайсковых частак куткоў нацыянальных рэгіёнаў» [1, с. 17]. А служыла тады колькасна пераважна сялянская моладзь мужчынскага полу, часова адарваная ад каласістых ніў, хлебаробства, гаспадаркі, бацькоўскіх хат.

У Я.І. Хлябцэвіча былі асобныя публікацыі савецкага перыяду дзейнасці, прысвечаныя знакавым постацям беларускай літаратуры: Я. Баршчэўскаму, Ф. Багушэвічу, Цётцы. М. Пажарыцкі дэталёва аналізуе артыкулы «Ян Баршчэўскі – першы беларускі пісьменнік XIX веку і ягонае апісанне партызанскага руху беларускіх сялян», «Царскі суд над творамі Ф. Багушэвіча», «Алаіза Пашкевіч (Цётка) – натхняльніца беларускага рэвалюцыйнага руху», «Беларуская Цётка (А. Пашкевіч)». Аўтар кнігі адзначае: «Звяртаючыся да творчасці Цёткі, бібліёграф-літаратуразнавец не мог не заўважыць, як адлюстравалася ў ёй аўтарка: біяграфія, рысы характару, светапогляд, адзіная, цэласная і адначасова шматгранная дзейнасць, сувязь жыццёвых акалічнасцей і гістарычнага моманту» [1, с. 26–27]. М. Пажарыцкі вызначае самыя сутнасныя дамінанты ідэйнага зместу артыкулаў, выяўляе найбольш важныя суджэнні і выказванні, адчувае ўсе тонкасці рэалізацыі аўтарскай задумы.

Не абыходзіць М. Пажарыцкі ўвагай нататкі, якія характарызуюць нацыянальную музыку і тэатр: «Нарыс беларускай народнай думкі», «Памяці А.Л. Бурбіса», «Беларусы ў Пецярбурзе». Апошняя публікацыя прысвячалася заснавальніку першага прафесійнага нацыянальнага беларускага тэатра Ігнату Буйніцкаму і яго калектыву.

Асобны раздзел адрасаваны матэрыялам Яўгена Хлябцэвіча другой паловы 40-х – пачатку 50-х гг. XX ст. пра жыццё і творчасць Янкі Купалы. Бачна, што Міхаіл Пажарыцкі ўважліва працаваў з фондамі Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (ДЛМЯнК) і асабістага архіва Я.І. Хлябцэвіча, перададзенага з Масквы ягоным пляменнікам для захавання і папулярызацыі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. «"Матэрыялы да манаграфіі Я.І. Хлябцэвіча пра Янку Купалу"

(захоўваюцца ў ДЛМЯнК. – Р. К.) – гэта цыкл артыкулаў купалазнаўца пераважна ў рукапісах, да якіх належыць і машынапіс з аўтарскімі чарнільнымі праўкамі; некаторыя работы суправаджаюцца друкаванымі аналагамі» [1, с. 38]. М. Пажарыцкі, аналізуючы матэрыялы знакамітага бібліёграфа пра жыццёвы і творчы шлях вялікага паэта, звяртае ўвагу на цікавы факт – «антыамерыканізм» абодвух дзеячаў: «"Антыамерыканізм" Янкі Купалы, як і Я.І. Хлябцэвіча, зводзіўся да пастулату, што шчасце трэба шукаць не за акіянам, а ў першую чаргу ў сябе дома, за іх, родны дом і шчасце ў ім, змагацца, пакутаваць, асабісты лёс будаваць разам з агульнанацыянальным» [1, с. 35]. У пачатку ХХ ст. мноства «тутэйшых» па прычыне кепскага эканамічнага становішча на роднай зямлі шукала заробку па-за межамі Айчыны, што непакоіла перадавых беларускіх дзеячаў. У раздзеле прыводзіцца малавядомая інфармацыя пра абставіны стварэння Янкам Купалам знакамітага верша «Прарок», які быў перададзены Я.І. Хлябцэвічу. М. Пажарыцкі зазначае, што выдатны бібліёграф меркаваў: «Імёны лепшых беларускіх пісьменнікаў трэба ўключаць у капітальную даведачна-энцыклапедычную літаратуру сусветнага ўзроўню, надзеленую базавымі навуковай і педагагічнай функцыямі» [1, с. 37].

М. Пажарыцкі кідае позірк на дакументы асабістага архіва Я.І. Хлябцэвіча, якія адсутнічалі ў манаграфічнай падборцы музея Янкі Купалы. Робіцца кароткі агляд літаратуры аб купалазнаўчай спадчыне бібліёграфа (Р. Семашкевіч, В. Скалабан, А. Бурбоўская і інш.).

Кніга М. Пажарыцкага – не проста канстатацыя наяўнасці прац і здабыткаў шматгадовай дзейнасці Я.І. Хлябцэвіча, а разгорнуты аналіз беларусазнаўчых дасягненняў бібліятэказнаўца з багатым цытаваннем у якасці доказнага матэрыялу. Аўтар кнігі падкрэслівае, што Я.І. Хлябцэвіч ствараў бібліяграфічныя агляды з моцным уласна-літаратуразнаўчым кампанентам як у цэлым па літаратурным працэсе, так і па пісьменніцкіх персаналіях. М. Пажарыцкі ненавязліва праводзіць думку, што адным з пачынальнікаў купалазнаўства з'яўляецца той жа Я.І. Хлябцэвіч. У канцы сваёй кнігі даследчык прыходзіць да высновы: «Беларусазнаўчая спадчына Я.І. Хлябцэвіча мае педагагічнае (як навучальнае, так і выхаваўчае) значэнне. Яго працы ўтрымліваюць звесткі і меркаванні аб зараджэнні новай беларускай літаратуры, далейшым развіцці літаратурнага працэсу, іншых відаў мастацтва, станаўленні айчыннай грамадска-філасофскай, грамадска-палітычнай і педагагічнай думкі, нацыянальных кнігазнаўчых і бібліятэказнаўчых тэндэнцыях» [1, с. 40].

Аўтар бібліяграфічнага нарыса прыкмеціў, што Я.І. Хлябцэвіч глыбока і сістэмна выявіў катэгорыю народнасці ў беларускай літаратуры, фальклорна-этнаграфічныя асновы прафесійнай мастацкай творчасці разнастайных аўтараў, унікальнасць беларускай ідэйна-тэматычнай і змястоўнай парадыгмы ў мастацтве слова. Такім чынам, адмысловая ўвага ў працы М. Пажарыцкага сканцэнтравана на канцэпцыі вядомага даследчыка па навучальнай і выхаваўчай функцыях беларускага літаратурнага руху, на яго арыгінальных характарыстыках і, смела можна сказаць, рэкамендацыях творчасці найбольш выбітных айчынных пісьменнікаў шырокаму чытачу, а не толькі вузкай элітарнай аўдыторыі аматараў мастацкага слова.

Дадзены бібліёграфа-аналітычны нарыс Міхаіла Пажарыцкага «Навукова-педагагічны дыскурс беларусазнаўчай спадчыны Я.І. Хлябцэвіча (да 140-годдзя з дня нараджэння бібліятэказнаўца)» будзе цікавым і карысным не толькі для філолагаў і бібліятэказнаўцаў, але і для шырокага кола прыхільнікаў беларускай культурна-гістарычнай спадчыны.

ЛІТАРАТУРА

1. **Пожарицкий, М. Б.** Научно-педагогический дискурс белорусоведческого наследия Е. И. Хлебцевича (к 140-летию со дня рождения библиотековеда) / М. Б. Пожарицкий ; под науч. ред. Е. Ю. Козленко. – Минск : БГУКИ, 2024. – 47 с.

2. **Итоговый** документ XI Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» (Минск, Национальная библиотека Беларуси, 24–25 октября 2024 г.) // Бібліятэчны свет. – 2024. – № 6 (141). – С. 3–7.

Summary

The article analyzes the book by M. Pazharitsky «Scientific and pedagogical discourse of the Belarusian studies heritage of E.I. Khlebtsevich's (on the 140th anniversary of the librarian's birth)».

«Бібліятэчны свет», 2025, № 3 (144). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 23.06.2025. Фармат 60x84⅛.
Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 417 экз. Заказ 53. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2025